**УДК 94(476)«1941/1953»**

# РОЛЯ НАРКАМА С. С. БЕЛЬЧАНКІ Ў БАРАЦЬБЕ З НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ І ПАСЛЯВАЕННЫМ АДНАЎЛЕННІ БЕЛАРУСІ

**А. Я. Ігнатовіч**
Магілёўскі інтстытут МУС Рэспублікі Беларусь,
дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

***Анатацыя.*** *Разглядаецца роля С. С. Бельчанкі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і пасляваенным аднаўленнем Беларусі. Ён быў арганізатарам партызанскага руху, міністрам унутраных спраў БССР.*
***Ключевыя словы:*** *Вялікая Айчынная война, партызанскі рух, бандытызм, МУС БССР.*

***Annotation.*** *The role of S. S. Belchenko in the fight against the Nazi invaders and the post-war restoration of Belarus is considered. He was the organizer of the partisan movement, the Minister of Internal Affairs of the BSSR.*
***Keywords:*** *Great Patriotic War, partisan movement, banditry, Ministry of Internal Affairs of the BSSR.*

Ёсць такія падзеі, якія правяраюць чалавека на трываласць: Вялікая Айчынная вайна стала выпрабаваннем для кожнага савецкага чалавека. Сяргей Савіч Бельчанка стаў актыўным удзельнікам і арганізатарам партызанскага руху, апошнім наркамам і першым міністрам унутраных спраў БССР. Разгледзім ролю С. С. Бельчанкі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і пасляваенным аднаўленні Беларусі.

Найбольш падрабязнай крыніцай звестак пра дзейнасць Бельчанкі з’яўляецца кніга А. Ю. Папова «15 сустрэч з генералам КДБ Бельчанка» [1]. У біяграфіі гэтага чалавека без яе няпроста зарыентавацца. Затое становіцца больш зразумела, як фарміравалася асоба гэтага чалавека, як назапашваўся жыццёвы і прафесійны вопыт, які дазволіў з гонарам справіцца з пастаўленымі перад ім найскладанейшымі задачамі ваеннага і пасляваеннага часу.

Сяргей Савіч нарадзіўся ў 1902 г. у сяле Салёнае Екацярынаслаўскай губерніі. Сын парабка ў пачатку 1920-х гг. стаў арганізатарам камсамола на Днепрапятроўшчыне. У гэты перыяд некаторы час Бельчанка быў байцом часці асаблівага прызначэння, што займалася барацьбой з бандытызмам. Затым служба ў берагавой артылерыі ў Севастопальскай прыморскай крэпасці, напрыканцы якой баец жадаў паступаць у Горны інстытут. Але далейшы шлях яго быў вырашаны словамі камісара артдывізіёна: «Вы, таварыш Бельчанка, чалавек ваенны…» [1, с. 14] — і вось ужо той вучыцца ў Кіеўскай ваеннапалітычнай школе, пасля заканчэння якой быў камандзіраваны на палітработу ў далёкую Сярэднеазіяцкую памежную акругу. На цяжкасці не скардзіўся.

Служба загартавала характар. Патэнцыял афіцэра трэба было развіваць, і вось ужо Бельчанка вучыцца і служыць у Маскве. Але змены на палітычнай карце восенню 1939 г. прыводзяць яго да кіраўніцтва Упраўленнем НКУС па Беластоцкай вобласці БССР.

Разведка інфармавала аб засяроджванні і разгортванні нямецка-фашысцкіх войскаў паблізу граніцы. Праца па ўмацаванню абароназдольнасці заходніх рубяжоў вялася вялікая, але ўсё ж з некаторым адставаннем ад патрабаванняў часу, без уліку абстаноўкі, якая хутка абвастраецца. У ноч на 22 чэрвеня 1941 года аператыўнікі НКДБ па Беластоцкай вобласці захапілі групу варожых дыверсантаў, пераапранутых у чырвонаармейскую форму, якія на допыце паведамілі, што раніцай пачнецца наступленне нямецка-фашысцкіх войскаў. У гадзіну ночы, калі знікла сувязь з заставамі, а пасля і з Мінскам, упэўненасць стала стопрацэнтнай. І Сяргей Савіч пачаў дзейнічаць. Не чакаючы ўказанняў непасрэднага кіраўніцтва, ён экстрана сабраў бюро абкама партыі і аб'явіў, што раніцай пачнецца вайна. Гэта быў смелы ўчынак, бо Бельчанку маглі папросту назваць панікёрам. Але ён гатовы быў несці любую адказнасць за кожнае сваё слова. На бюро было прынята некалькі важных рашэнняў — аб эвакуацыі жыхароў, вывазе дакументаў.

Дарогі вайны прыводзяць яго пад Житомір, дзе ЦК КП(б)Б на аснове вынесенага рашэння аб арганізацыі партыйнага і камсамольскага падполля і партызанскага руху была праведзена нарада па канкрэтным ажыццяўленні гэтага найважнейшага ваенна-палітычнага мерапрыемства. Падкрэслім ініцыятыўнасць Бельчанкі ў гэтым складаным пытанні: адыходзячы на ўсход, ён пакінуў у Беластоку дзве чэкісцкія групы для вядзення дыверсійнай барацьбы.

Але ў Магілёве С. С. Бельчанка атрымаў новае прызначэнне — намесніка начальніка Асобага аддзела Заходняга фронту. Удзельнічаў і ў абароне Масквы, выконваў асобыя даручэнні камандуючага войскамі Заходняга фронту Г. К. Жукава, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга ў снежні 1941 г.

У маі 1942 г. Бельчанку прызначылі начальнікам Заходняга штаба партызанскага руху. А яшчэ праз год — намеснікам начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху, што узначальваў былы першы сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка, які выдатна ведаў здольнасці і вопыт Сяргея Савіча. ЦШПР каардынаваў дзейнасць усіх атрадаў народных мсціўцаў, якія дзейнічалі на акупаваных гітлераўцамі тэрыторыях. Але партызаны не толькі знішчалі жывую сілу і тэхніку ворага. Важны быў і багаты чэкісцкі вопыт С. С. Бельчанкі, бо партызаны вялі актыўную разведку, здабывалі найважнейшыя звесткі аб праціўніку. У далейшым афіцэр дэманстраваў талент стратэга. Намеснік

начальніка ЦШПР пры Стаўцы ВГК (красавік – лістапад 1943 г.) удзельнічаў у планаванні шматлікіх аперацый, у тым ліку і легендарнай «Рэйкавай вайны».

У вызваленым Гомелі, які ляжаў у руінах, С. С. Бельчанка, незадоўга да гэтага прызначаны на пасаду наркама ўнутраных спраў БССР, з нуля займаецца арганізацыяй дзейнасці міліцыі. У той перыяд яна на 90 працэнтаў будзе складацца з былых партызан, якіх трэба было навучыць асаблівасцям нялёгкай міліцэйскай службы. А задачы стаялі найскладанейшыя. У тыле нашых войск сталі з'яўляцца і актыўна дзейнічаць банды, падрыхтаваныя і пакінутыя немцамі для падрыўной работы. У рэспубліцы былі зарэгістраваны шматлікія бандыцкія праявы, тэрарыстычныя акты і іншыя цяжкія злачынствы. На Бельчанку ўскладалася персанальная адказнасць за барацьбу з бандытызмам. Для ліквідацыі банд былі задзейнічаны ўсе сілы і сродкі.

Краёўцы, аунаўцы, банды Рагнера, Котвіча, Сібірака ў Заходняй Беларусі — міліцыя адкрыла фронт непрымірымай барацьбы з імі. Бандыты ўзрывалі масты і адміністрацыйныя будынкі, забівалі вайскоўцаў і партыйных работнікаў. Тактыку барацьбы выкарыстоўвалі разнастайную. Напрыклад, укаранялі ў рады злачынцаў агентаў. Стаўка на агентуру спрацоўвала і тады, калі міліцыі і вайскоўцам супрацьстаялі не нацыяналістычныя банды, не звычайныя крымінальнікі, а добра падрыхтаваныя дыверсанты.

Бельчанка ўспамінае пра дзень, якога чакаў увесь савецкі народ усе гады вайны: «Дзень Перамогі я сустрэў у баявых умовах. На захад ад горада Ліда ў лясным масіве я кіраваў аперацыяй па ліквідацыі буйной групоўкі, якая складалася з дзвюх банд — Рагнера і Котвіча. Акружаныя шчыльным кальцом бандыты, спрабуючы вырвацца, адчайна супраціўляліся. У гэты момант наш радыст даклаў аб капітуляцыі Германіі. Натхнёныя весткай байцы рынуліся наперад і знішчылі бандытаў. Гітлераўскі агент Рагнер быў узяты жывым» [1, с. 129].

Бандыты жорстка супраціўляліся, у тым ліку замахваліся на жыццё С.С. Бельчанкі. Хто ведае, як развіваліся б падзеі пасляваеннага перыяду ў Беларусі, калі б 16 кастрычніка 1946 г. куля снайпера дасягнула мэты… Становішча заставалася цяжкім, і ўсё ж дзякуючы самаадданай працы міліцыянераў ужо да 1947 г. пастаўленая кіраўніцтвам краіны задача была выканана: буйныя бандфарміраванні цалкам былі знішчаны.

Больш дробныя банды сышлі ў падполле, і барацьба з імі працягвалася. У сваіх дакладных запісках міністр унутраных спраў БССР рэгулярна паведамляў у ЦК КП(б)Б пра затрыманых дэзерціраў, прыслужнікаў фашыстаў, уласаўцаў, паліцыянтаў, здраднікаў, якія служылі ў Беларускай краёвай абароне, пра злачынцаў, якія ўцякалі з турмаў, лагераў, са ссылкі. Адны прыбіваліся да банд, іншыя спадзяваліся адсядзецца… Занепакоенасць

выклікалі тады беспрытульнікі. Дзіцячыя дамы былі разбураны, тысячы сірот блукалі па гарадах і вёсках (многія з іх сталі злачынцамі). Вырашаючы найскладанейшыя задачы, на пасадзе кіраўніка беларускай міліцыі Бельчанка праслужыў 10 гадоў (1943–1953).

Сяргей Савіч Бельчанка пражыў амаль 100 гадоў. Цяжкі перыяд Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенных гадоў для яго аказаўся звязаны з беларускай зямлёй. Увесь яго вопыт чэкіста, кіраўніка быў скарыстаны для арганізацыі і развіцця партызанскага руху, для барацьбы з фашыстамі і іх памагатымі, з крымінальным бандытызмам. У нас няма права забываць пра такіх людзей, як наш герой.

---

1. Попов А. Ю. 15 встреч с генералом КГБ Бельченко. М. : ОЛМА Медиа Групп, 2002. 383 с. Вернуться к статье